## Прамова тав. ЧАРВЯКОВА, А. Г.

Таварышы, жыцьцё і праца Савецкай Беларусі, якая мяжуецца з кап талістычнымі краінамі, служаць заўсёды об'ектам увагі варожых Савецка Уладзе сіл гэтых суседніх капіталістычных дзяржаў. У прыватнасьц Савецкая Беларусь увесь час складае об'ект увагі для польскае буржу азіі, якая культывіруе ў польскай грамадзе думку аб неабходнасьці ўклю чэньня Савецкае Беларусі ў склад Польскай рэспублікі.

На жаль, у мяне няма пад рукамі ўсіх матар'ялаў, на падставе які я мог-бы праільлюстраваць гэту думку. Аднак, карыстаючыся выпад кам, я прывяду некаторыя факты, з якіх вы ўбачыце, што мы ў Саве кай Беларусі жывём, працуем, будуем соцыялістычную гаспадарку, увес час знаходзячыся пад пагрозаю, што нас „хочуць зьесьці" пражорлівы прадстаўнікі польскай буржуазіі. Яшчэ ў часы Савецка-Польскай вайн ў 1920 годзе галава польскае дзяржавы—маршал Пілсудзкі, захапіўш сваім войскам сталіцу Беларусі Менск, зьвярнуўся да беларускаг насельніцтва з адозваю, у якой казаў аб тым, што ён прышоў спась „забыты богам і людзьмі край" ад бальшавікоў і забясьпечыць нас леньню гэтага краю далейшае разьвіцьцё на аснове саюза вольны з вольнымі і роўных з роўнымі. І вось гэта думка аб тым, што польска дзяржава ставіць сваёй мэтаю ўзяць пад сваю апеку наш забыты бога і людзьмі край, называемы Беларусіяй, які, як відавочна, забыты, пол

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ская буржуазія хоча ўключыць у свае межы,—гэта думка і цяпер паступова праводзіцца ў цэлым шэрагу выступленьняў і заяваў, як паасобных політычных грамадзкіх дзеячоў, афіцыйных асоб, гэтак і ў друку і г. д., і г. д. У 1924 годзе былы тады прэзыдэнтам польскай рэспублікі Г. Вайцэхоўскі, выступаючы з прывітаньнем перад адным з пазнанскіх палкоў казаў аб тым, што трэба імкнуцца да таго, каб Польшча стала вялікаю дзяржаваю. Для таго-ж, каб яна стала сапраўды вялікаю дзяржаваю, патрэбна, казаў ён, зьніштожыць тыя прычыны, якія перашкаджаюць ёй у гэтым, гэта значыць—павялічыць яе тэрыторыю. Гэта імкненьне Польшчы да павялічэньня яе тэрыторыі Вайцэхоўскі аформіў у сваёй прамове асабліва яскрава. Зьвяртаючыся да салдатаў, ён сказаў, што „за цяперашняю мяжою Польшчы знаходзяцца яшчэ польскія землі, да Польшчы не далучаныя“. Заява, як бачыце, вельмі яскравая і адказная. Дабаўлю тут-жа, што газэта польскіх соцыял-здраднікаў, Польскіх соцыялістых ППС, „Работнік“, гаворачы аб гэтай прамове ў артыкуле пад назваю „Яшчэ аб пазнанскіх прамовах“, папракала Вайцэхоўскага толькі за тое, што ён занадта адкравенна кажа аб такіх рэчах, аб якіх лепей было-б да пары да часу памаўчаць („Работнік“ № 124 за 7 траўня 1924 г.).

У 1925 годзе вышла цікавая кніжка вядомага пэпээсаўскага дзеяча ў Польшчы Лявона Васілеўскага: „Гісторыя ППС“. Гэта кніжка праводзіць думку аб тым, што ППС як партыя, зьяўляецца партыяй барацьбы за незалежнасьць Польшчы, прычым Польшча разумеецца партыяю ППС, як дзяржава, аднаўленая ў сваіх гістарычных межах, гэта значыць з уключэньнем у склад Польшчы былога Вялікага княства Літоўскага, гэта ёсьць Беларусі.

У 1926 годзе падобныя заявы прымаюць сыстэматычны і хронічны характар. Гэтак, Віленская манархічная газэта „Слова“, якая вельмі блізка да цяперашняга міністра Юстыцыі Польшчы г. Мэйштовіча, дакарае былых дзеячоў Польшчы за заключэньне Рыскае мірнае ўмовы. У № 298, за 23 сьнежаня 1926 года, у перадавым артыкуле пад назваю: „Беларусы ў Латгаліі“ гаворыцца: „Адным з фатальных пладоў палітычнай бязглуздасьці, недалёкасьці і вузкасьці думкі тварцоў Рыскага трактату зьяўляецца сучаснае становішча беларускага пытаньня. Падзел напал Беларусі сваімі нязьлічанымі пасьледкамі прыносіць нам клопаты і страты. Для ўсіх тых, якія хоць колькі-небудзь орыентыраваліся ў сапраўдным становішчы рэчаў, якія рэальна глядзелі на рэчы, а ня марылі аб сваёй асабовай славе, ці аб перамозе свае партыі,—для ўсіх іх было ясна, што Рыскі трактат зьяўляецца суцэльнаю абмылкаю і што гэта—не перамога, а ганебнае паражэньне“.

Віленская прогрэсыўная газэта „Кур'ер Віленскі“ (орган, блізкі ўрадавым колам) у № 14, за 19 студзеня 1927 года ў перадавым артыкуле „Польшча і Беларусы“ кажа: „Мы згаджаемся з тым, што Рыскі трактат быў злачынствам у адносінах да гісторыі. Аднак, мы пацьвярджаем, што ён толькі затрудніў магчымасьць вядзеньня актыўнай беларускай полі-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

тыкі, але, ва ўсякім разе, не паралізаваў гэтае магчымасьці. Сёньня яшчэ ня позна. Калі-б яшчэ зараз Польшча кінула лёзунг садружаства з нацыянальным рухам народнасьцяй, існуючых на землях даўняга вялікага княства Літоўскага, дык перад намі зноў мог-бы адчыніцца шлях да гістарычнай вялікасьці. Барацьба з-за беларускай душы яшчэ ня скончана. Пры адыходзе Рэчы Паспалітай на Захад яшчэ ня ўсе масты спалены (разумеецца, для руху наперад), шлях наперад яшчэ магчымы".

Газэта „Голос Правды", таксама газэта, вельмі блізкая да ўрадавых колаў, у адным артыкуле піша: „Трэба навучыць нашу грамадзкасьць разумець, што накіраваньнем вялікадзяржаўнай экспансыі Польшчы зьяўляецца Ўсход і што шлях для зьдзяйсьненьня гэтае мэты вядзе праз згоду з народамі, якія жывуць на ўсходніх акраінах Рэспублікі".

З гэтых невялікіх прыкладаў, вы, таварышы, бачыце, што буржуазная грамадзкая думка Польшчы культывіруе ідэю вялікадзяржаўнай экспансыі лічачы натуральны шлях на ўсход праз Савецкую Беларусь, а таксама праз Савецкую Ўкраіну. Між іншым надзвычайна цікава і тое, што нанова назначаны начальнік ўсходняга аддзелу міністэрства замежных спраў Польшчы, [illegible] перад сваім назначэньнем зьмясьціў у Віленскай газэце „Кур'ер Віленскі" артыкул, у якім ён разьбірае пытаньне адносна магчымасьці зьдзяйсьненьня „гістарычных" задач польскай буржуазіі, аб пашырэньні тэрыторыі Польшчы на Ўсход за лік Савецкай Беларусі, а асабліва за лік Савецкай Ўкраіны. Я бязумоўна ня хочу гэтым сказаць, калі буржуазныя рукі заграбучыя, дык гэтым рукам удасца заграбаць тое, што хочацца заграбаць. Мы ведаем, што польская буржуазія ня ёсьць польскі народ, і што рабочыя і сяляне Польшчы думаюць інакш. Мы зьяўляемся сьведкамі, як рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі і ўсяе Польшчы балюча бьюць па руках польскую буржуазію, стрымліваючы гэтым апэтыты пражорлівых паноў.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы